Б.-А. Д. У. К.
С.-А.Г.П.Б.
Инв.
Б 2252

РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА БЕЛАРУСІ

№ 31 (176)

За павышэньне ўраджайнасьці калгасных палёў

Сваячасовая і старанная падрыхтоўка насеньня— адна з асноўных умоў павышэньня ўраджайнасьці. На гэта ў сучасны момант павінна быць зьвернута асабліваая ўвага.

Усё насеньне вызначанае для пасеву на 1933 год павінна быць **поўнасьцю адсартавана**. Калі ў пасобных калгасах не хапае збожжаачышчальных машын (трыеры, сартоўкі), **неабходна арганізаваць перакідку такіх з адных калгасаў у другія.**

Пытаньне збожжаачышчэньня трэба зараз-жа перанесьці для прасоўваньня і праверкі ў вытворчыя брыгады, якія моцна зацікаўлены ў найлепшай ачыстцы насеньня, у найбольшым пэўным скарыстаньні збожжаачышчальных машын.

Сьледам за ачысткай саўгасы і калгасы абавязаны абясшкодзіць насеньне ад галаўні. Галаўнёю ці сажаю заражаюцца авёс, ячмень, пшаніца, жыта, проса і кукуруза.

Заражаная гэтай хваробай культура пан жае ўраджайнасьць на 10—15 проц. і больш. Адсюль барацьба з галаўнёй павінна быць кожным калгасам і саўгасам уключана ў лік пэўных абавязковых мерапрыемстваў.

Адным са спосабаў абясшкоджаньня насеньня ад галаўні зьяўляецца яго **пратручваньне**. Пратручваньне насеньня ў буйных калгасах і саўгасах праводзіцца з дапамогай спэцыяльных машын. Для сухога пратручваньня ўжываецца машына АБВ-1 і „Ураджай", для вільготнага—„Экстра".

Пратручваньне фармалінам, вільготным і поўсухім спосабам трэба рабіць перад самым пасевам, бо загадзя пратручанае гэтым спосабам насеньне можа зноў заразіцца галаўнёю.

Сухі спосаб пратручваньня мае цэлы рад пераваг, ён дае магчымасьць рабіць пратручваньне загадзя, за адзін-два месяцы да пасеву. Насеньне, пратручанае гэтым спосабам, не баіцца паўторнага заражэньня галаўнёю і пры захоўваньні не псуецца грызунамі і іншымі сьвірнавымі шкоднікамі.

Скарыстоўваць у харч ці ў корм такое насеньне катэгарычна забараняецца. Каб не зьмяшаць з харчовым насеньнем, пратручанае насеньне патрэбна захоўваць у асобным памяшканьні.

Малацьба ў калгасе „Барацьбіт" Пухавіцкага раёну.

Для правільнага правядзеньня работы па пратручваньні насеньня калгасы павінны вылучыць спэцыяльныя брыгады Брыгадзіры гэтых брыгад павінны прайсьці праз раённыя курсы, або праз бліжэйшыя машыназьнішчальныя станцыі, навучыцца правільнаму скарыстаньню атруты і тэхніцы самой работы па пратручваньні насеньня.

Можа здарыцца, што ў калгасах няма пратручвальнікаў (фармаліну, прэпарату АБ, парыскай зелені і інш.). У гэтым выпадку калгасам ці саўгасам павінны быць прыняты меры, каб пратруціць насеньне прасьцейшым спосабам. З боку НКЗБ, цэнтральнай машыназьнішчальнай станцыі павінны быць даны раёнам належныя ўказаньні і інструкцыі ў правядзеньні гэтай работы.

Ачысткай і пратручваньнем насеньня яшчэ не канчаецца яго падрыхтоўка. Трэба **загадзя выпрабаваць насеньне на ўсхожасьць праз прарошчваньне.** Няўсхожае насеньне дарма прападае. Калгасы павінны арганізаваць прарошчваньне насеньня.

Выключная ўвага павінна быць аддана **ахове насеньня**. У першую чаргу па лініі аховы насеньня ад раскрадваньня, псаваньня, падпалаў і пажараў. Праўленьні калгасаў павінны вылучыць найбольш надзейных калгасьнікаў, спэцыяльных вартаўнікоў для аховы насеньняхавальнікаў.

На справу барацьбы за лепшую падрыхтоўку насеньня да сяўбу і лепшую захаванасьць яго трэба ўзьняць усю калгасную масу.

Асабліваую ўвагу трэба аддаць таксама нагляду за насенным матар'ялам, папярэджваючы яго псаваньне ад няправільнага захоўваньня.

Увесь насенны матар'ял павінен быць разьбіт па сваёй гатунковай і фізычнай якасьці на партыі і кожную партыю трэба захоўваць у асобным засеку. Вільготнае зерня трэба захоўваць асобна ад сухога. Пры захоўваньні ўроссып зерня трэба яго рассыпаць па падлозе насеньняхавальнікаў роўным пластом таўшчынёю, гледзячы па ступені вільготнасьці. Прычым вільготнае зерня насыпаць пластом ня больш $^1/_3$ мэтра. Пры хаваньні ў засеках таўшчыня пласта—3—3,5 мэтра. Пры хаваньні ў тары мяшкі трэба ўкладваць тройкамі або пяцёркамі ў правільныя рады і штабэлі (для сухога насеньня — ня вышэй 15 радоў, для вільготнага—ня больш 6—7 радоў).

Кожны калгас павінен вылучаць адказнага за захаваньне насеньня, які-б кожны дзень правяраў яго становішча. Пры выяўленьні награваньня насеньня трэба абавязкова яго перамешваць і праветрываць насеньняхавальнік.

Усе моманты падрыхтоўкі насеньня, яго мабілізацыя, ачыстка, пратручваньне, прарошчваньне і догляд за насеньнем, а таксама дакладная ахова яго зьяўляюцца важнейшай часткай падрыхтоўчай работы калгасаў да вясны 1933 году.

Аграном **В. Александровіч.**

На вокладцы: Студэнтка Энэргетычнага Інстытуту (Мекск) тав. Ідэльчык, былая работніца друкарні—пераплётчыца.

ВЫКАНАЕМ ПОЎНАСЬЦЮ ПЛЯН ТАВАРАЎ ШЫРСПАЖЫВУ

Важнейшае палітычнае значэньне маюць пастановы верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб вырабе тавараў шырокага ўжытку. Разгортваньне гэтай работы адыграе вялікую ролю ў справе пасьпяховага разьвіцьця калгаснага гандлю, у справе паляпшэньня матар'яльнага становішча рабочых і сялян, у справе замацаваньня змычкі паміж горадам і вёскай.

У барацьбе з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, таксама з „левым" апартунізмам і з контр-рэвалюцыйным трацкізмам партыя дабілася вялізарнейшых перамог у справе сацыялістычнай індустрыялізацыі нашай краіны.

Рост цяжкай індустрыі, сацыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі і рост тэхнічных культур стварылі ўмовы павялічэньня тэмпаў разгортваньня лёгкай прамысловасьці. У 1931 годзе лёгкая прамысловасьць узрасла параўнальна з 1928 г. на 71 проц., а такія галіны прамысловасьці, як: швэйная ўзрасла за гэты час на 276 проц., трыкатажная—на 140 проц., абутковая—на 266 і гарбарная—на 134.

Але ўзросшыя патрэбы рабочых і калгасьнікаў патрабуюць павялічэньня тэмпаў разгортваньня вырабу прадметаў шырспажыву. Згодна пастаноў ЦК УсеКП(б) была павялічана вытворчая праграма па вырабе прадметаў шырспажыву на 1932 г. „Было скарочана канкрэтна па аб'ектах па-за рыначнае спажываньне тавараў шырспажыву; пастаноўлена арганізаваць пры прадпрыемствах уцільцэхі з мэтай скарыстаньня адыходаў для дадатковага вырабу прадметаў шырспажыву; арганізован спэцыяльны сэктар шырспажыву ў сыстэме Наркамцяжпраму" (з пастановы пленуму ЦК УсеКП(б).

Пленум адзначыў **нездавальняючае выкананьне праграмы па вырабе прадметаў шырокага ўжытку.** Па Наркамлёгпраму праграма за 8 месяцаў гэтага году выканана толькі на 88,4 проц. Па Наркамцяжпраму—на 81 проц., па прамысловай каапэрацыі—на 93,3 проц.

Таксама нездавальняюча ідзе выраб тавараў шырспажыву па Беларусі. Па лёгкай прамысловасьці БССР за першы квартал плян выканан на 94,3 проц., а за трэці квартал—на 63 проц. Па сыстэме Белкаапсаюзу гадавая праграма за 8 месяцаў выканана на 55,7 проц.

Асноўнай прычынай невыкананьня праграмы зьяўляецца „усё яшчэ нязжытая гаспадарчымі арганізацыямі недаацэнка вялізарнейшага значэньня для народна-гаспадарчага жыцьця вырабаў прадметаў шырокага ўжытку". Таксама дрэнна адбіваецца на выкананьне праграмы шырспажыву **нездавальняючая арганізацыя вытворчасьці, неканкрэтнае кіраўніцтва ёю, нездавальняючая арганізацыя працы і няправільная палітыка зарплаты** (няверная тарыфікацыя вядучых прафэсый). Аднэй з прычын невыкананьня пляну па шырспажыву зьяўляецца **невыстарчальнае абслугоўваньне бытавых патрэб рабочых і работніц лёгкай прамысловасьці,** зьніжэньне працдысцыпліны на прадпрыемствах і нізкая прадукцыйнасьць працы.

Ёсьць імкненьні некаторых гаспадарнікаў тлумачыць невыкананьне пляну аб'ектыўнымі прычынамі, адсутнасьцю сырцу і іншым. Гэта няправільна. Прыкладам зьяўляецца бавоўна, якая да рэвалюцыі ў Расію ўвозілася з-за мяжы, а ў 1932 г. мы атрымаем столькі сваёй бавоўны, што нам ня прыдзецца яе ўвозіць.

У дакладзе аб выніках верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) таварыш Кагановіч адзначыў: „Мы маем рад галін прамысловасьці, якія працуюць у значнай частцы на ўцільсырцу. Многіх з вас, напэўна, зьдзівіць, калі я скажу, што ваўняная прамысловасьць можа працаваць на 50 проц. на ўцільсырцу, папяровая прамысловасьць—на 25 проц., ватняя і катанінная прамысловасьць—22—25 проц. уцілю, гумовая прамысловасьць—на 25 проц. уцілю, толевая—на 80 проц., галянтарэйная ў пераважнай частцы на ўцілях".

Гэта значыць, што многія галіны вытворчасьці маюць вялікія крыніцы сырцу, але неабходна яго набыць. На гэтым трэба сканцэнтраваць увагу і мабілізаваць творчую ініцыятыву мас, каб не прападалі адкіды. **Не павінна больш быць адкідаў, а павінна быць уціль-сыравіна,** не павінна прападаць больш старых валёнкаў і ўсякай грубай бавоўны і іншых адкідаў па гарадох і вёсках.

Перадавыя рабочыя і работніцы на справе ўзяліся за скарыстаньне адкідаў на сваёй вытворчасьці для вырабу прадметаў шырспажыву. Так, на заводзе імя Ланцуцкага (Гомель) з адкідаў мэталю наладзілі выпуск грабель, утулак для колаў, вілак, зубоў для боран і інш. рэчаў. Сталяры з адкідаў дрэва выраблюць этажэркі, а з адкідаў бляхі робяцца вёдры, лёйкі, умывальнікі і іншыя.

Па ініцыятыве рабочых і работніц менскай швэйнай фабрыкі „Кастрычнік" арганізован уцільцэх, дзе з абрэзкаў матэрыі, абрыўкаў ваты і іншых выраблюць туфлі, коўдры, рубашкі, майткі, фартухі.

Шмат ёсьць прыкладаў бальшавіцкай барацьбы рабочых і работніц за пашырэньне вырабу прадметаў шырокага ўжытку. Але шырокія масы рабочых і работніц не мабілізаны яшчэ на гэту справу. Яшчэ ня ўсе разумеюць, што ад барацьбы за ўцільсыравіну залежыць у значнай ступені выраб прадметаў шырспажыву, паляпшэньне матар'яльнага дабрабыту рабочых і калгасьнікаў.

На выкананьне дырэктыў пленуму па разгортваньні вырабу прадметаў шырспажыву неабходна мабілізаваць шырокія масы рабочых і работніц. Неабходна арганізаваць шырокі збор рабочых прапаноў па скарыстаньні адкідаў. Неабходна дабіцца поўнай ліквідацыі прарываў, якія ёсьць у галіне вырабу прадметаў шырспажыву.

Важнейшае значэньне ў справе вырабаў шырспажыву грае саматужная прамысловасьць, якая павінна па СССР у гэтым годзе выпусьціць прадукцыі на 6 мільярдаў рублёў, з якіх $^2/_3$ складаюць тавары шырокага ўжытку. Таму зусім зразумела што нельга недаацэньваць значэньня сампрамкаапэрацыі зараз. Неабходна забясьпечыць яе сырцом, палепшыць матар'яльна-бытавыя ўмовы саматужнікаў. Вялікую ролю мае саматужная прамысловасьць у арганізацыі рамонту абутку, вопраткі і г. д., што таксама адыгрывае вялікую ролю ў справе барацьбы з недахопам тавараў.

Баявы абавязак кожнай дэлегаткі, работніцы, саматужніцы—змагацца за выкананьне дырэктыў партыі аб разгортваньні тавараў шырспажыву.

Дамо краіне прадукцыю шырокага спажыванья

Кузьня заводу імя Варашылава. Распаленае жалеза гібка паддаецца ўдарам молату. Просты кавалак хутка набывае розны выгляд — выгнуты і напоўвыгнуты.

— З розных адкідаў у нас вырабляюцца прадметы шырокага спажыванья для вёскі, — кажа начальнік цэху тав. Ключ. Тут і

т. Карпава—ударніца, сьлесар заводу імя Варашылава.

падковы, накладкі на восі, завесы,—усё самае неабходнае ў калгаснай і аднаасобнай гаспадарцы. Мы таксама не забылі хатняй гаспадыні вёскі і гораду. Для яе мы робім трыножкі, патэльні.

Але гэта яшчэ ня ўсё. Яшчэ адзін вельмі важны прадмет вырабляецца ў сьлясарным цэху. Гэта—вісячыя замкі.

— Замок мае 17 апэрацый— тлумачыць тав. Ключ. На гэтай рабоце працуе 11 чалавек, сярод якіх, як бачыце, шэсьць дзяўчат.

За трэці квартал **завод выканаў плян па выпуску прадукцыі шырспажыву на 101 проц.** Дзяржава атрымала прадукцыі на 122 тыс. рублёў.

Работніцы скардзіліся, што ў замковым цэху слаба праводзіцца масавая работа. Усе яны камсамолкі. Ёсьць магчымасьць арганізаваць цэхавую камсамольскую ячэйку. Тады справа пайшла б лепш. Зараз гэты цэх прымацован да сьлясарна - зборачнага. Дрэнна таксама, што ў цэху апрача начальніка няма ні аднаго партыйца.

* * *

Уцільцэх гарбарні „Бальшавік“ арганізован у ліпені. З адкідаў вырабляюцца **загатоўкі, балеткі, баціначкі для дзяцей школьнага ўзросту і для маленькіх дзетак да трох год.**

За трэці квартал плян выканалі на 133 проц. Але за першыя дзесяць дзён кастрычніка быў прарыў. Гэта таму, што аслабла масавая работа ў сувязі з адпачынкамі. Да таго, яшчэ быў прасгой машын.

Гэта было нецярпіма для ўдарнікаў чырвонасьцяжнага заводу „Бальшавік“. Парткалектыў і заўком зараз-жа мабілізавалі ўсю масу на ліквідацыю прарыву. Зараз мы ўжо бачым вынікі. З 10 па 15 кастрычніка плян выканан на 117 проц., з 15 па 20 кастрычніка таксама на 117 проц. Пры такіх тэмпах да першага лістапада прарыў будзе поўнасьцю ліквідаваны.

Зараз масавая работа палепшылася. Пачала выходзіць цэхавая насьценгазэта, праўда, яшчэ ненармальна, але пачын ужо зроблен. У складзе рабочых у большасьці былыя саматужнікі.



Выраб замкоў з адкідаў на заводзе „Ударнік“, (Менск).

Вельмі цяжка праводзіць сярод іх масавую работу. Аднак мы бачым і вялікія посьпехі. Рабочыя ахоплены падпіскай на пазыку на ўсе 100 проц.

Трэба яшчэ многа зрабіць, каб поўнасьцю абсталяваць цэх. Памяшканьне таксама не прыстасавана для абутковай майстэрні. Парткалектыў і дырэкцыя заводу павінны ўсё гэта ўлічыць і стварыць усе ўмовы для пасьпяховага выкананьня пляну па выпуску прадукцыі шырокага спажыванья.

Л.

Менск.

Работніцы Асінторфу настойліва змагаюцца з недахопамі

Да XV гадавіны Кастрычніка работніцы Асінторфу ўзялі на сябе рад абавязацельстваў па ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы і паляпшэньні якасьці прадукцыі.

Створаны жаночыя брыгады імя XV Кастрычніка. Работніцы таксама ўзялі на сябе абавязацельствы — сачыць за работай трусагадоўчай фэрмы, за апрацоўкай гародніны на прыгароднай гаспадарцы, наглядаць за чысьцатой у сталоўках і пякарнях.

Першы агляд выкрыў многа недахопаў. Ёсьць безгаспадарчасьць па гадоўлі сьвіней—адна сьвінаматка ў год прывяла адно—паўтары парася ў сярэднім. Гэта сьведчыць аб тым, што на сьвінагадоўчым заводзе няма гаспадарчага вока.

Брыгады работніц змагаюцца з усімі гэтымі недахопамі.

Рабкор.

Аркадзь Куліненка

ІНВЭНТАР № 205

Ледзь ранішні золак
падкраўся
да ночы,
Працяжна прагуў
над пасёлкам гудок,
Ты першай
бадзёрай
на фабрыку крочыш,

т. Бабковіч—лепшая ўдарніца заводу „Полымя рэвалюцыі“ (Менск).

па бруку грыміць твой
разьмераны крок.
* * *
Ня мала разоў
пабывала наўмысьля,
па справе
машынкі [1])
у цэхавым БРЫЗ'е [2]).
Слова „прарыў“
над заводам
павісла,
а твой інвэнтар
пачынае капрызіць
Ты помніш:
Работніцы цэху
крычалі
— Хутчэй, не барыся,
трэ' сшыткі
сшываць...

Тут сіла
бурліла
ва ўдарным адчаі,
І гулкая
кроў
пачынала ўскіпаць.
Забегалі рукі
па шрубіках кволых,
Уключыліся
ў шэлест
трансьмісій.

Як сьпіцы мігцелі
ў разогняных колах,
а пруткія жылы
агнём
наліліся.

Я ведаю—
ў месячнік штурму
нарады,
Брыгада рабочых
сышлася
праверыць:
Па 300 звыш пляну
давала ў
дэкаду
ты чыстых
сшыткаў
паперы.

Я бачыў,
праходзячы
сёньня
па цэху,—
Рабочыя часта
на дошку
глядзяць.

Цябе
ўспамінаюць тут
з нейкай уцехай,
і твой інвэнтар
205.

Цяпер ня відно цябе
ў цэхавым
ляманце—
Зьмяніла
калібры
нажовак,
на тлустыя рысы
густога
атраманту,
на чысты
гранёны
аловак,
Цяпер падымае
Разьлівасьць
сырэн,
І зноў бязупынна
сталёвым
запалам,
ты вывучаеш
будоўлю
мартэн
і мудрасьць радкоў „Капіталу“,
А заўтра цябе мо'
пакліча гудок,
Паказваць працы узоры,
Я веру,—
будзе грымець
твой крок
Такім,
як учора,
бадзёрым.

г. Добруш.

т. Кароль—упакоўшчыца мяккага шакаладнага цэху фабрыкі „Камунарка“. (Менск). Лепшая ўдарніца, дэлегатка.

---

[1]) Інвэнтар № 205—машынка, якая сшывае сшыткі.

[2]) Брыгада рацыяналізацыі і вынаходніцтва.

Падрыхтоўка кадраў—важнейшая задача

„СССР вышаў на першае месца ў сьвеце па колькасьці вышэйшых навучальных устаноў і навучаючыхся ў іх. Мы павінны ў найбольш кароткі тэрмін дабіцца такога павышэньня якасьці падрыхтоўкі пралетарскіх спэцыялістаў, каб ня толькі па колькасьці, але і па якасьці вышэйшай асьветы быць наперадзе капіталістычных краін. Гэта настойліва дыктуецца ростам сацыялістычнага будаўніцтва, для якога праблема кадраў зьяўляецца зараз цэнтральнай праблемай". („Правда").

Магутны размах індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, задача пабудовы ў другой пяцігодцы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва патрабуюць хутчэйшага вырашэньня задачы падрыхтоўкі добра-кваліфікаваных кадраў.

Вялікіх посьпехаў дабіўся Савецкі саюз у справе падрыхтоўкі кадраў.

Ужо два гады, як у Савецкім саюзе праводзіцца абавязковае ўсеагульнае навучаньне. За гэты час колькасьць вучняў у школе павялічылася больш чым на 50 проц. Каля 20 млн. дзяцей навучаюцца зараз толькі ў пачатковых школах Савецкага саюзу.

У той-жа час у капіталістычных краінах усюды скарачаецца колькасьць школ і настаўнікаў. Нават у Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных штатах—гэтай перадавой капіталістычнай краіне—ёсьць цяпер больш 4 млн. няпісьменных дзяцей старэй 10-ці г.

Вялізарнейшых посьпехаў дабіўся Савецкі саюз у справе разгортваньня сеткі ВНУ і тэхнікумаў, дзе зараз навучаецца 15 млн. чалавек. Такой лічбы ня ведае яшчэ ні адна капіталістычная краіна. У сувязі з крызісам, які перажываюць капіталістычныя краіны, колькасьць вучняў у ВНУ увесь час там скарачаецца.

Аднак, тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, вострая патрэба ў інжынэрах, тэхніках, аграномах, пэдагогах і інш. прымушаюць нас не задавольвацца гэтымі дасягненьнямі.

Нам патрэбна значна больш кадраў і асабліва лепшай якасьці.

Вялікае значэньне ў справе паляпшэньня якасьці падрыхтоўкі кадраў маюць пастанова ЦК УсеКП(б) „Аб вучэбных праграмах і рэжыме ў пачатковай і сярэдняй школе" і пастанова ЦВК СССР „Аб вучэбных праграмах і рэжыме ў вышэйшай школе і тэхнікумах".

Асноўная задача праграм пачатковай і сярэдняй школы заключаецца ў тым, каб забясьпечыць высокую агульную адукацыю вучняў, сыстэматычнае выкладаньне ведаў, сувязь навуковых ведаў з жыцьцём, барацьбой і сацыялістычным будаўніцтвам.

Сярэдняя школа павінна падрыхтаваць для тэхнікумаў і ВНУ зусім пісьменных людзей, якія добра ўладаюць асновамі навук (фізыка, хэмія, матэматыка, родная мова, геаграфія і інш.).

У сувязі з гэтым ЦК пастанавіў:

„У мэтах ажыцьцяўленьня праграмы партыі „аб правядзеньні бясплатнага і абавязковага агульнага і палітэхнічнага (знаёмячага ў тэорыі і на практыцы з усімі галоўнымі галінамі вытворчасьці) навучаньня для ўсіх дзяцей абодвух полаў да 17 год" (праграма УсеКП(б)), а таксама ў мэтах хутчэйшага падняцьця ўзроўню агульна-асьветнай і палітэхнічнай падрыхтоўкі навучаючыхся ў сярэдняй школе, пашырэньня падрыхтаваных кантынгентаў для вышэйшай школы і адхіленьня ўзроснай неадпаведнасьці паміж сярэдняй і вышэйшай школай, прыступіць, пачынаючы з 1932—33 навучальнага году, да рэарганізацыі сямігадовай палітэхнічнай школы ў дзесяцігадовую.

Выходзячы з гэтага, прапанаваць СНК СССР у месячны тэрмін зацьвердзіць канкрэтны плян і разьмеры арганізацыі ў наступным навучальным годзе над сямігодкай 8-х груп, як першы крок да дзесяцігадовай школы" ЦК УсеКП(б).

Вялікім недахопам ВНУ зьявілася адсутнасьць дакладна вызначанай спэцыяльнасьці кадраў, якія выпускаюцца кожнай ВНУ. Гэта ня гледзячы на тое, што нашы ВНУ перабудаваны па прынцыпах галін вытворчасьці.

Вялікім гістарычным дасягненьнем нашых ВНУ зьяўляецца бесьперапынная вытворчая практыка. Аднак, шмат дзе гэтым дасягненьнем ня могуць карыстацца. Замест таго, каб вытворчая практыка дапаўняла агульна-тэарэтычную вучобу, часта яна нічога агульнага ня мае з апошняй. Ня рэдкі выпадкі, калі студэнты на практыцы скарыстоўваюцца як чорнарабочыя. Вытворчая практыка не павінна быць нечым самастойным, а павінна быць падпарадкавана агульна-тэарэтычным і спэцыяльным дысцыплінам.

У пастановах ЦК і ЦВК вялікае месца аддаецца мэтадам выкладаньня.

Як у пачатковай і сярэдняй, так і ў вышэйшай школе пашырыўся, як асноўны, „лябараторна-брыгадны мэтад", „які суправаджаўся арганізацыяй сталых і абавязковых брыгад, якія прывялі да скажэньняў у выглядзе абязьлічкі ў вучэбнай рабоце, да зьніжэньня ролі пэдагога і ігнараваньня ва многіх выпадках індывідуальнай вучобы кожнага навучаючагася".

Гэтыя скажэньні лябараторна-брыгаднага мэтаду павінны быць ліквідаваны.

Неабходна павысіць ролю настаўнікаў, ролю выкладчыкаў. „Асноўнай формай арганізацыі вучэбнай работы ў пачатковай і сярэдняй школе павінен зьяўляцца „урок" з данай групай вучняў са строгавызначаным раскладам заняткаў і цьвёрдым складам вучняў". На лекцыі прымяняюцца, пад кіраўніцтвам настаўніка, розныя мэтады навучаньня.

Як у пачатковай і сярэдняй, так і ў вышэйшай школе ўводзіцца абавязковы індывідуальны і сыстэматычны ўлік ведаў кожнага навучаючагася, праверачныя іспыты ў канцы году для навучаючыхся.

У пастанове ЦВК СССР аб ВНУ сказана,

„што ў справе масавай падрыхтоўкі кадраў спэцыялістаў у сучасны момант асноўнай задачай зьяўляецца замацаваньне дасягнутых посьпехаў і далейшая барацьба за павышэньне тэарытычнай адукацыі ў ВНУ, ВТНУ і тэхнікумах, пры ўсямерным далейшым умацаваньні іх сувязі з вытворчасьцю, узьняцьцем якасьці вучобы і сапраўдным заахвочаньнем ініцыятывы і энэргіі кожнага навучаючагася ў яго вучэбнай рабоце.

Больш адказнасьці выкладчыкаў і вучняў за іх работу, поўная ліквідацыя абязьлічкі ў працы школ патрабуюць пастановы.

Вялікае месца ў пастанове аддана пытаньням дысцыпліны і парадку ў школе.

„ЦК прапануе павесьці настойлівую выхаваўчую работу, змагаючыся з парушаючымі парадак у школе праступкамі вучняў, прыцягваючы да гэтай справы грамадзкія арганізацыі, бацькоў, камсамольскія і пія-

УВАГА КУЗЬНІ КАДРАЎ ТАРФЯНІКАЎ

Максымум увагі. Ні адно слова выкладчыка не пралятае міма студэнтаў. Складаныя формулы, чарцяжы акуратна запісваюцца ў сшытак, словы выкладчыка ловяцца на-хаду. Напружанасьць у працы адчуваецца адразу ж пры ўваходзе ў торфінстытут.

Званок парушыў цішыню аўдыторыі і калідораў. Лекцыя ўжо скончана пару хвілін, але ў калідоры яшчэ няма ніводнага студэнта.

Кожны зацікаўлен, каб атрымаць максымум ведаў, аўладаць тэхнікай. У аднэй, другой і трэцяй аўдыторыі на перапынках абмяркоўваюцца пытаньні, узьнікшыя ў часе лекцыі.

Інстытут зараз вельмі ўпарта працуе над праламленьнем у сябе пастановы ЦВК СССР аб вышэйшай школе.

Выпрацаваны статут, строгія правілы ўнутранога распарадку. Першыя два курсы пераведзены на выключна - тэарэтычныя заняткі, а вытворчая практыка пачнецца з трэцяга курсу. **Усе студэнты пераведзены на аплату стыпэндыі па пасьпяховасьці.** Добра пасьпяваючы студэнты апошніх курсаў атрымліваюць 210 р., а не пасьпяваючыя менш ста.

Дзякуючы гэтым мерапрыемствам **значна ўзмацнілася дысцыпліна і якасьць вучобы.**

З 3400 студэнтаў інстытуту на заняткі спазьніліся за кастрычнік пяць на вельмі нязначны час. Прагулы скараціліся да мінімуму. Але гэта толькі пачатак перабудовы працы інстытуту. Уперадзе вялізная работа па зьнішчэньні тых зрываў, якія зараз ёсьць у інстытуце.

Яшчэ не ўстаноўлен тэрмін навучаньня таму і нельга скласьці сталыя праграмы, а толькі на бліжэйшы час. Інстытут кепска забясьпечан выкладчыкамі. З 144 выкладаючых у інстытуце і тэхнікуме толькі 16 стала працуюць на гэтай працы, а астатніх патрэбна кожны раз лавіць. Няма падрыхтаваных кіраўнікоў катэдраў. На чале толькі аднэй катэдры з 10, якія ёсьць у інстытуце, стаіць прафэсар, а ўсе іншыя толькі інжынэры. **Профіль (ясна вызначаная спэцыяльнасьць) будучага спэцыяліста, якога павінен выпускаць інстытут, да гэтага часу невядомы.**

Адна з лепшых ударніц вучобы, студэнтка II курсу мэханіч. аддзял. Тарфянога Інстытуту.

Бібліятэка зусім кепска забясьпечана спэцыяльнай тэхнічнай літаратурай, а літаратура на белмове зусім адсутнічае. Вельмі дрэнная справа з памяшканьнем. З-за недахвату памяшканьня зусім ня выкліканы на вучобу першыя курсы інстытуту і тэхнікуму.

Нельга не сказаць і аб бытавых умовах. Сталоўка працуе вельмі ненармальна. Ня гледзячы на тое, што ўжо затрачана на гэту справу шмат сродкаў, якасьць абедаў нездавальняючая, а таксама цэны высокія.

Інтэрнаты вельмі перанаселены. Там, дзе павінна жыць 5 студэнтаў, жыве 10—12 чалавек. Культабслугоўваньне ў інтэрнатах, як газэты, радыё і інш., яшчэ не наладжана. Вядома, што ўсе гэтыя, недахопы ў значнай ступені тармозяць перабудову работы паводле пастановы ЦВК.

Неабходна адзначыць, што вышэйшыя кіруючыя арганізацыі, як Наркамцяжпрам, Белторф, Белсампрамторф, зварачаюць зусім мала ўвагі на наладжаньне нармальнай працы інстытуту — кузьні кадраў тарфянікаў.

Па віне Наркамцяжпраму не ўстаноўлены тэрміны навучаньня, а таму і сталыя праграмы, няма профілю будучага спэцыяліста тарфяніка, не аддаецца ўвага бытавым умовам выкладчыцкага складу, якія забясьпечваюцца вельмі кепска.

Кіручыя арганізацыі толькі тады цікавяцца, калі пачынаецца тарфяны сэзон і калі вельмі патрэбны спэцыялісты — правільна заяўляе дырэктар інстытуту тав. Ляшчынскі.

* * *

Кадры тарфянікаў зараз неабходны тарфяной прамысловасьці БССР. Таму слабая ўвага тарфяному інстытуту зьяўляецца злачыннай. Наркамцяжпрам, Белторфаб'яднаньне павінны павярнуцца тварам да торфінстытуту.

Партарганізацыя, калектыў студэнтаў і выкладчыкаў на аснове ўкараненьня ў жыцьцё інстытуту пастановы ЦВК СССР бязумоўна выправяць гэтыя недахопы.

К.

Падрыхтоўка кадраў—важнейшая задача *(працяг)*

нэрскія арганізацыі, а няспраўных з вучняў, хуліганствуючых і зьневажаючых вучэбны пэрсанал, парушаючых распараджэньні адміністрацыі школы і настаўнікаў і ламаючых школьны рэжым, псаваўшых ці рабаваўшых школьную маемасьць—выключаць са школы бяз права паступленьня ў школу тэрмінам ад аднаго да трох год".

Ня меншае значэньне мае дысцыпліна і ў ВНУ. Надаючы вялікае значэньне ў справе падрыхтоўкі кадраў настаўнікаў, ЦК абавязвае наркамасьветы Саюзных рэспублік, савецкія і партыйныя арганізацыі забясьпечыць неабходныя ўмовы для работы настаўнікаў, абавязковае выкананьне дырэктыў ЦК і СНК СССР аб прыраўнаньні настаўніка па забесьпячэньні прадуктамі і прамтаварамі да прамысловага рабочага, стварыць умовы настаўніку для сыстэматычнай работы па павышэньні сваіх ведаў. Баявы абавязак кожнай дэлегаткі, кожнай работніцы, калгасьніцы, працоўнай жанчыны—змагацца за выкананьне гэтых пастаноў партыі і ўраду.

М.

Барацьба работніц у Германіі

Германскі капіталізм безнадзейна змагаецца за захаваньне сваёй ўлады і за сваё існаваньне. Усё ўзрастаючы крызіс патрасае асновы капіталістычнага ладу. У выніку крызісу буржуазія наносіць новыя ўдары пралетарыяту. Супярэчнасьці паміж меншасьцю багатых і мільённымі арміямі працоўных, зьбядненьне дробнай буржуазіі і сялянскай беднаты становяцца ўсё больш вострымі. Буржуазія праз сваю ўладу выдае адзін надзвычайны ўказ за другім. **Лік беспрацоўных дасягае 6 млн., прычым звыш 1½ млн. з гэтага ліку работніц.** Праца на прадпрыемстве становіцца катаржнай. Фашысцкі тэрор ставіць сабе задачай „отрезвить" масы. У гэтай абстаноўцы выкоўваецца воля рабочых мас да адпору наступленьню буржуазіі і ўлады.

Лік забастовак узрастае. Штодзенна новыя прадпрыемствы ўключаюцца ў забастовачны рух пад кіраўніцтвам КПГ і рэвалюцыйнай прафапазыцыі. Пры гэтым забастоўкі апошніх тыдняў і месяцаў адрозьніваюцца тым, што ў іх **усё больш рашучы ўдзел прымаюць работніцы.**

Сярод работніц усё ўзмацняецца абурэньне зьмяншэньнем зарплаты. Работніцы ўсё больш і больш пераконваюцца ў тым, што капіталістычная дзяржава ня можа даць ім ніякага паляпшэньня, а наадварот, нясе ім толькі галечу, беспрацоўе і пазбаўляе іх нават жыльля.

Калі ў 1930 годзе работніца ў мэталёвай прамысловасьці атрымлівала ў сярэднім ад 20 да 25 марак у тыдзень, то ў 1931 годзе яна зарабляла толькі 11,36 марак. У студзені мінулага году зарплата яшчэ раз была зьніжана на 10 проц. Прадпрыемцы, апіраючыся на ўрадавы ўказ, прыступаюць на гэтых днях да новага зьніжэньня зарплаты. Улада прадстаўляе прадпрыемцам права зьніжаць зарплату і скасоўваць дагавары.

Прадпрыемца цэлымі тыднямі нічога ня плаціць са сваёй кішэні новым работніцам, бо дзяржава бярэ на сябе абавязак выплачваць прадпрыемцам з так званых „дзяржаўных сродкаў", г. зн. з сум, выціснутых з дапамогай падаткаў, па 400 марак за кожнага новага рабочага, 15 марак штотыднёвай зарплаты для работніцы, прычым прадпрыемца



Беспрацоўныя ў Парыжы сьпяць на лесьніцы.

з уласнага капіталу на працягу 7-мі тыдняў ня плаціць ні капейкі зарплаты, а работніца 27 тыдняў павінна павялічваць прыбытак свайго гаспадара. Зарплата работніц прыносіць прадпрыемцам максымальную карысьць. І буржуазія, вуснамі свайго прадстаўніка былога міністра Дарнбурга, адкрыта заяўляе:

„што зьніжэньне выдаткаў на зарплату і захаваньне вывазу на ранейшым узроўні магчымы толькі пры ўжываньні жаночай працы".

Як нізка зарплата работніц, можна ўпэўніцца на наступным прыкладзе:

Фірма Гертнэра ў Пэйтпе з 15 верасьня 1932 году выплачвае сваім работніцам наступныя стаўкі:

Работніцам старэй 22-х год	—	20	пфэнігаў	—	17	пфэнігаў у гадзіну
„	—	20	„	—	17	„ „ „
„	—	18	„	—	14,5	„ „ „
„	—	16	„	—	12	„ „ „
малодшых	—	16 год		—	10	пфэнігаў у гадз.

Зарплаты работніцы не хапае на жыцьцё. 45 проц. сваёй зарплаты, а часамі і больш работніца аддае за кватэру. Частка ідзе на паездкі на фабрыку і дамоў, і толькі нязначная частка зарплаты работніцы застаецца на ўтрыманьне сваёй сям'і.

У гэтай абстаноўцы абурэньне работніц палітыкай прадпрыемцаў дасягае найвышэйшых разьмераў.

Работніца, якая атрымала выхаваньне ў хрысьціянскім прафсаюзе ў духу запаведзі пакорнасьці да сваіх паноў, усё ахвотней адгукваецца на заклікі рэвалюцыйнай прафапазыцыі да забастоўкі супроць эксплёататараў. У часе забастовак тэкстыльшчыц у Мюнхэне-Гладбаху, на фабрыцы Юнкерса і Сімэнса, работніцы з хрысьціянскіх прафсаюзаў, наперакор прафсаюзным правадыром, прынялі ўдзел у забастоўцы і стаялі ў перадавых радох у якасьці кіраўнікоў барацьбы супроць зьніжэньня зарплаты.

Тэкстыльшчыцы фабрыкі Мэлера і Хорна паказалі сваю сьвядомасьць, выступаючы супроць сваіх прадпрыемцаў. Калі рабочыя даведаліся аб тым, што прадпрыемцы хочуць скараціць зарплату на 30 проц., то некалькі адважных работніц на другую раніцу зьявіліся да варот фабрыкі і заклікалі таварышоў ня йсьці на фабрыку, а баставаць.

„Мы не павінны нападаць з-за вугла на сваіх таварышоў, і на фабрыцы Франка і Гэрыгнона мы павінны таксама баставаць, пратэстуючы супроць зьніжэньня зарплаты".

Вось словы, з якімі гэтыя работніцы зьвярнуліся да таварышоў па рабоце. Іх заклік аказаўся пасьпяховым, і іншыя работніцы і рабочыя арганізавана пастанавілі пачаць забастоўку.

Як работніца, апіраючыся на вопыт, набыты ў барацьбе, зноў з узмоцненымі сіламі ўступа ў бой, — паказвае той незабыўны для пралетарыяту прыклад, які далі работніцы кабэльнага заводу

Ронэдорфа ў Сярэдня-Рэйнскай мэталёвай прамысловасьці.

Калі пасьля пераможнай барацьбы прадпрыемцы патрабавалі ад работніц вярнуцца на фабрыку, работніцы адказалі: „Мы арганізавана вышлі на забастоўку і таксама арганізавана прыступім да работы". Работніцы накіраваліся да іншых рабочых са сьпевам „Інтэрнацыяналу" і з чырвонымі сьцягамі вярнуліся на фабрыку. Рэфармісцкія і хрысьціянскія прафсаюзныя правадыры імкнуцца затрымаць работніц ад удзелу ў баёх, сеюць сярод іх упадачны настрой, імкнуцца вербаваць штрэйкбрэхэраў. Але ўсё ўзрастаючы вопыт прымушае неарганізаваных работніц у часе гэтых боек злучаць свае рады вакол камуністычнай партыі Германіі і рэвалюцыйнай прафпазыцыі. Яны на сваім вопыце ўпэўніваюцца ў тым, што хрысьціянскія і рэфармісцкія прафправадыры стараюцца затрымаць барацьбу за паляпшэньне іх становішча і што толькі КПГ РПО*) паказваюць правільны шлях. Таму прафсаюзным правадыром рэфармісцкіх і хрысьціянскіх саюзаў усё горш і горш становіцца затрымаць хвалю забастовак. Вось чаму яны прабуюць станавіцца на чале асобных забастовак, каб у спрыяючы для прадпрыемцаў момант зрываць выступленьні, пагоршваючы становішча работніц.

Работніцы разумеюць гэты манэўр і пад кіраўніцтвам КПГ і РПО пачынаюць усё энергічней вылучаць свае сілы з агульнай масы, занятай на вытворчасьці і з асяродзішча беспрацоўных, каб усё сьмялей і пасьпяховей пераходзіць у наступленьне на буржуазію і яе ўрад і адрываць рабочыя масы ад хрысьціянскіх, рэфармісцкіх і фашысцкіх правадыроў.

У той час, як германскія работніцы пераходзяць да ўсё больш шырокіх і ўпартых боек са сваімі прыгнятальнікамі, з цкавальнікамі новай вайны з Савецкім саюзам, у той час, як яны павялічваюць сваю мужнасьць, адважнасьць і ўменьне граць кіруючую ролю ў барацьбе з прыгнятальнікамі, савецкія работніцы свабодна сьвяткуюць XV-годзьдзе пераможнай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Зараз, праз 15 год, вызваленыя ад уціску работніцы і жанчыны змогуць падвесьці вынікі пераможнага будаўніцтва сацыялізму, г. зн. тэй справе, на якой яны пасьпяхова загартавалі свае сілы, перамагаючы ў барацьбе ўсіх ворагаў і перамагаючы ўсе цяжкасьці.



Каб падтрымаць высокія цэны на малако, капіталісты Амэрыкі распарадзіліся выліць 1508 галонаў малака.

15 гадавіна, як сьвята пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, мае ўсё большае значэньне для германскіх работніц. Яна будзе дапамагаць замацаваньню ўсяго баявога фронту прыгнечаных усіх краін, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і Камінтэрну, для выступленьня супроць капіталістычных нападаў, супроць фашызму, супроць небясьпекі імпэрыялістычных войнаў і зьвяржэньне ўласных эксплёататараў, за перамогу рабочай клясы ва ўсім сьвеце.

Ф. К.

*) РПО—рэвалюцыйная праф. апазыцыя.

Выканалі абавязкі па здачы бульбы

Калгас „Камунар" (Казловіцкага сельсавету. Слуцкі раён) поўнасьцю скончыў уборку бульбы.

Лепшымі ўдарнікамі па ўборцы бульбы зьяўляюцца: **Русак Яўгеня, Кахановіч Прося, Мірончык Ганна, Путкевіч Рыпіна, Путкевіч Ліда, Мірончык Воля і Мірончык Ліда,** якія нормы выпрацоўкі перавыканалі ў паўтары разы. Замест нормы—накапаць і рассартаваць 25 пудоў—яны выкапалі і рассортавалі па 35 пудоў кожная.

Загатоўка ў калгасе праходзіць ударнымі тэмпамі. Калгасу трэба было здаць дзьве тысячы пудоў бульбы. **Калгасьнікі, абгаварыўшы плян здачы (продажу) бульбы дзяржаве, высунулі сустрэчны плян. Замест двух тысяч пудоў, яны абавязаліся здаць 2100 пудоў. На 20-Х поўнасьцю выканалі і перавыканалі плян здачы.**

Калгасьнікі посьпехаў дабіўся дзякуючы правядзеньню шырокай масава-растлумачальнай работы сярод калгасьніц і калгасьнікаў, добрай расстаноўцы сіл у брыгадах, дзякуючы спалучэньню ўборкі бульбы і здачы яе дзяржаве. Калгас адразу з поля накіроўваў фурманкі з бульбай на загатоўчыя пункты.

Прыклад калгасьнікаў калгасу „Камунар" па выкананьні сваіх абавязкаў перад дзяржавай павінны падхапіць усе калгасы Случчыны.

Брыгада часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі":
Я. Кучур,
Я. Мірончык,
М. Чухонскі.

ЗА ЎСЯМЕРНАЕ ПАВЫШЭНЬНЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ, ЗА А

З 28-га кастрычніка па 8 лістапада праводзіцца дэкада ўраджаю і калектывізацыі, якая мае вялікае гаспадарча-палітычнае значэньне. Задачай дэкады зьяўляецца, на падставе шырокага азнаямленьня рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас з посьпехамі сацыялістычнай індустрыялізацыі СССР і БССР і падвядзеньня вынікаў сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, мабілізаваць іх актыўнасьць **„вакол задачы павышэньня ўраджайнасьці, як галоўнай і цэнтральнай задачы сельскай гаспадаркі на даным этапе, вакол арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.** Адначасова дэкада павінна быць выкарыстана для **павышэньня тэмпаў правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній (загатоўкі, зяблёва, сканчэньне азімай сяўбы і інш.)“** (з пастановы ЦК КП(б)Б).

Побач з бліскучымі посьпехамі ў галіне прамысловасьці, уступленьием у строй усё новых і новых гігантаў цяжкай прамысловасьці, шпаркім ростам лёгкай прамысловасьці, рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дабілася вялізарнейшых дасягненьняў і ў галіне перабудовы сельскай гаспадаркі.

Жаночы абоз з хлебам калгасу „Новае жыцьцё“, Кіеўскай вобласьці.

У 1932 г. мы маем 53 МТС у 45 тыс. конскіх сіл і вясной 1933 г. МТС будуць ахоплены усе раёны і калгасы. Калгасы засеялі ў 1932 г. 50 проц. усяго пасеву БССР без саўгасаў. На адзін калгасны двор прыходзіцца пасеву 3,91 га, тады як на адзін двор аднаасобнікаў толькі 2,2 га. У 1932 годзе толькі адны калгасы атрымалі ад дзяржавы мінэральных угнаеньняў на 1.700.000 руб., сельска-гаспадарчых машын на 8 млн. Ужо на 1-IX у калгасах налічваецца 1.537 МТФ з лікам адных дойных кароў 8.847 штук, СТКФ 2.038 з лікам сьвінаматак 52.231 штука. Значна палепшылася справа арганізацыі працы ў калгасах.

Вось коратка тыя лічбы, якія сьведчаць аб вялізарнейшым росьце калгаснай вытворчасьці. У адпаведнасьці з імі з кожным днём паляпшаецца культурна-бытавое становішча калгасаў і кожнага калгасьніка паасобку.

Як правіла, рост даходнасьці калгасу, падваеньне, а то і патраеньне супроць мінулага году атрымліваемай на рукі калгасьнікамі часткі агульнага даходу даюць амаль усе калгасы, у гэты даход у параўнаньні з даходам аднаасобніка, значна вышэйшы.

У часе дэкады ўраджаю і калектывізацыі неабходна мабілізаваць самыя шырокія масы рабочых і работніц саўгасаў, МТС, калгасьнікаў і калгасьніц на выкананьне пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб павышэньні ўраджайнасьці. Не павінна быць ніводнай работніцы саўгасу, МТС, калгасьніцы, ніводнай дэлегаткі, актывісткі ў вёсцы, якія-б не вялі актыўнай барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці.

Увядзеньне севазвароту, добраякасная апрацоўка глебы, сяўба ачышчаным, пратручаным і гатунковым насеньнем, сяўба радковая, а не ручная, угнаеньне — вось тыя асноўныя паказальнікі, за якія павінны весьці рашучую барацьбу калгасы ў барацьбе за ўраджай.

Дэкада ўраджаю і калектывізацыі п
шырока разгорнутай зімовай агр
паходам за аўладаньне агразоатэх
рабочых саўгасаў, МТС і калгасьні
тэхнічных гурткоў, курсаў, аграз
гутарак, лекцый і г. д.)

ЬЦІ, ЗА АЎЛАДАНЬНЕ АГРАРНАЙ НАВУКАІ І ТЭХНІКАЙ

Зяблева значна павышае ўраджайнасьць і скарачае тэрміны веснавой сяўбы і таму яно павінна стаць ударным мерапрыемствам, каб **дабіцца выкананьня і перавыкананьня пляну ў 800.000 га па калгасах.**

ЦК абавязаў усіх вясковых камуністаў і камсамольцаў у найкарацейшы тэрмін аўладаць тэхнікай буйнай сацыялістычнай сельска-гаспадарчай вытворчасьці і агразоатэхнікай з тым, каб напярэдадні веснавой сяўбы 1933 году ўся КП(б)Б і ЛКСМБ выйшлі ўзброенымі канкрэтнымі ведамі барацьбы за сапраўднае павышэньне ўраджайнасьці і ня толькі самым бароцца за іх ажыцьцяўленьне, але арганізаваць на гэтую справу шырокія масы работніц. саўгасаў, МТС, калгасьніц. Дэлегацкія сходы і паасобныя дэлегаткі павінны праявіць ініцыятыву ў справе прыняцьця сацыялістычных умоў на лепшае аўладаньне агра-зоатэхнікай, „на лепшую падрыхтоўку да пасеўнай кампаніі інвэнтару, захаваньне ў патрэбнай колькасьці і якасьці гатунковага насеннага матар'ялу, на ўсваеньне і ажыцьцяўленьне калгасамі, саўгасамі і МТС у часе сяўбы патрэбных агратэхнічных умоў і інш."

У „дэкаду ўраджаю і калектывізацыі" неабходна правесьці шырокія сходы калгасьнікаў з прыцягненьнем рабочых саўгасаў, МТС і аднаасобнікаў, паставіць на сходах справаздачныя даклады калгасаў аб папярэдніх выніках гаспадарчага году, завастрыўшы ўвагу на дасягненьнях і недахопах, асабліва па асеньніх работах, разгарнуць масавыя экскурсіі ў лепшыя саўгасы, МТС і калгасы, арганізаваць скліканьне міжкалгасных і раённых вытворчых канфэрэнцый і зьлётаў сельска-гаспадарчымі выстаўкамі. У гэтыя дні арганізаваць прэміяваньне лепшых калгасаў, брыгад і паасобных ударнікаў. Трэба дабіцца, каб „дэкада ўраджаю і калектывізацыі" ператварылася ў дэкаду масавага агляду посьпехаў сацыялістычнага земляробства, у дэкаду масавай мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў вытворчасьці на ліквідацыю выяўленых недахопаў і прарываў. Трэба дабіцца, каб у выніку правядзеньня „Дэкады ўраджаю і калектывізацыі" калгасы і калгасныя масы вышлі яшчэ больш згуртаванымі, больш арганізаванымі, больш здольнымі весьці пад кіраўніцтвам партыі далейшае наступленьне па шляху сацыялістычнага будаўніцтва, каб у выніку гэтых дней **дабіцца рашучага пераломуў справе падняцьця ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі, у справе барацьбы за аўладаньне тэхнікай буйнай сацыялістычнай сельска-гаспадарчай вытворчасьці і агразоатэхнікай.**

Дэлегаткі, актывісткі—у першыя рады барацьбы за высокі ўраджай.

Н.

Гэта значыць, што наступіў час, калі ад росту гаспадаркі ўшыркі, шляхам павялічэньня пасеўных плошчаў, неабходна павярнуць да барацьбы за лепшую апрацоўку зямлі, да барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці, як галоўнай і цэнтральнай задачы ў галіне сельскай гаспадаркі на данай стадыі разьвіцьця. (З паст. ЦК КП(б)Б).

Комсамолка Жарына за абрубкай сьвёклы (саўгас „Мойдарава", Маскоўскай вобласьці).

ктывізацыі павінна зьявіцца пачаткам
зімовай агратэхнічнай прапаганды,
е агразоатэхнікай шырокімі масамі
С і калгасьнікаў (арганізацыя агра-
урсаў, агразоатэхнічных габінэтаў,

(З пастановы ЦК КП(б)Б)

ДАСЯГНЕНЬНІ КАЛГАСУ „1-е МАЯ“

Калгасьнікі калгасу „1-е мая“, Слуцкага раёну падышлі да сьвяткаваньня XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі з буйнымі перамогамі ў барацьбе за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасу. Гэтыя перамогі дасягнуты пад кіраўніцтвам раённай партарганізацыі, партячэйкі і праўленьня калгасу ў мабілізацыі калгасьнікаў на выкананьне гаспадарча-палітычных кампаній у бязьлітаснай барацьбе з клясавым ворагам.

Вось паказальнікі.

Сяўбу азімых калгас правёў па-ўдарнаму, на плошчы 100 га, або 100 проц. пляну і скончыў яе да 23 верасьня.

Плян зяблівага ворыва калгас выканаў на 100 проц. Зазяблена 120 га.

Уборка бульбы на плошчы 43 га закончана 17-га кастрычніка. **Зараз ідзе пераворванье плошчы.** Ужо пераворана 25 га.

Посьпех уборкі, як і сяўбы і зяблёва, рашыла правільная арганізацыя працы, сваячасовая падрыхтоўка, шырока праведзеная масавая работа сярод калгасьнікаў і калгасьніц.

Такіх-жа перамог калгас дабіўся і ў сіласаваньні кармоў. Калгасам засіласавана 210 тон.

Абавязкі перад пралетарскай дзяржавай — у першую чаргу. Гэты лёзунг пастаўлен у цэнтр увагі калгасьнікаў і ўзорна выконваецца калгасам. Калгас па пляну павінен здаць (прадаць) дзяржаве збожжа 50 цэнтнэраў. Але калгас высунуў сустрэчны і здаў 54 цэнт. да 30 верасьня.



Зяблівае ворыва ў саўгасе „Блонь“, Пухавіцкі раён.

Плян бульбазагатовак выканан калгасам на 70 проц., зараз калгас заканчвае здачу бульбы.

Датэрмінова ўнесены падатак і страхоўка—46 000 руб. На пазыку „4-ты заключны“ калгас падпісаўся на суму 4 280 руб. **За ўдарную рэалізацыю пазыкі калгас прэміяван НКФ БССР на суму 300 руб. і ганаровай граматай.**

Значных посьпехаў калгас дабіўся і ў разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Калгас мае МТФ з лікам 202 галовы і СТФ з лікам 115 галоў. Пляны ўкамплектаваньня і здачы (продаж) таварнай прадукцыі дзяржаве фэрмамі выконваецца ўзорна. Зараз МТФ і СТФ ацяпляюцца, кармы падрыхтаваны.

Дзякуючы ўдарнаму правядзеньню ўборачнай кампаніі і пастаноўкі барацьбы са стратамі, ў цэнтр увагі, калгас атрымаў магчымасьць шырока разгарнуць гандаль сваёй дадатковай прадукцыяй. **У горадзе Слуцку калгас мае свой уласны ларок, праз які прадаваў і прадае вялікую колькасьць гародніны.** Ларок адчынен з мая месяца. На сёнешні дзень праз ларок прададзена: бульбы—40 цнт., капусты—34,5 цнт., гуркоў—60 цнт., памідораў—14,5 цнт., а таксама морквы, бручкі, ягад, малака, груш і інш. Усяго прададзена рознай прадукцыі 280 цнт. праз ларок на суму 20 275 руб.

Гэта значна павялічыла даход калгасу і кожнага калгасьніка.

Калгас цалкам ліквідаваў ураўнілаўку. Уся праца ў калгасе праводзіцца толькі на аснове лёзунгу: „хто больш і лепш працуе, той больш атрымлівае, хто не працуе, той нічога не атрымлівае“.

Адзінай формай арганізацыі працы ў калгасе зьяўляецца пастаянная вытворчая брыгада.

У выніку гэтых перамог на фронце арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасу значна павысілася даходнасьць калгасу ў цэлым і кожнага калгасьніка ў паасобку ў параўнаньні з мінулым годам. Аб гэтым яскрава гаворыць праведзенае прыкладнае разьмеркаваньне ўраджаю і прыбыткаў.

Вось, што атрымалі і атрымліваюць у 1932 годзе паасобныя калгасьнікі і калгасьніцы.

Калгасьнік Брэўда Арон з сваёй сям'ёй у 4 душы выпрацаваў у 1931 годзе 1249.86 працадзён і атрымаў: жыта—451,2 кгр, пшаніцы—250 кгр, бульбы—1765 кг і грашыма 297 руб. 57 кап.

У гэтым годзе Брэўда пры выпрацоўцы 908 працадзён атрымае: жыта—908 кгр, пшаніцы—



Дойка кароў на малочнай фэрме Гарадзішчанскага калгасу (Украіна).

181,5 кгр, бульбы—3684кгр, ячменю—295,1 кгр, аўса—328 кгр, буракоў кармовых—1410 кгр і грашыма 3441 руб. 32 кап.

Гэтыя лічбы гавораць самі за сябе.

* * *

Шлях калгасу „1-е мая“—гэта шлях бязьлітаснай барацьбы з клясавым ворагам, які на працягу ўсяго часу імкнуўся разбурыць калгас знутры.

Да вясны мінулага году калгасам кіравала група кулакоў і спэкулянтаў на чале з вядомым спэкулянтам - контрабандыстам Гіндзілевічам. Гэта група ўзяўшы кіраўніцтва разбурыла калгас і давяла ўвесну калгасную жывёлу да надзвычайна цяжкага становішча.

Слуцкі РК КП(б)Б тады заняўся гэтай справай. Было адноўлена кіраўніцтва. На пасаду старшыні пастаўлен камуніст тав. Казёл Васіль, які і на сёньняшні дзень кіруе калгасам.

Янка Кучур.

ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАК

Хачу ўступіць у калгас

(*Ліст аднаасобніцы*)

Да 1928 году я не мела зямлі, Батрачыла на працягу доўгага часу. Дзякуючы савецкай уладзе ў 1928 годзе мне выдзялілі 3 га зямлі пахаці.

Мне 80 год, але-ж я вельмі жадаю працаваць у калгасе. Хоць і ня так хутка спраўлюся з работай як другая маладзейшая калгасьніца. Буду працаваць добрасумленна і з вялікай ахвотай.

— Я добра зразумела, што ў калгасе толькі і жыць батрачцы, тут ужо ня будзе плётак і зьдзекаў. Я вельмі добра памятаю, як ад абшарніка Пратасевіча атрымала плёткі за тое, што без дазволу пайшла ў кузьню серп ладзіць, які зламаўся ў часе жніва. Замест добрага слова ў мяне засталіся шрамы на сьпіне. Ня гледзячы на тое, што працавала ў абшарніка за 20 к. удзень ад усходу сонца да цёмнага.

Я кожны дзень агітую сына, каб ён запісаўся сам у калгас і мяне, бо гаспадарка лічыцца на яго. Калі-б сын толькі запісаўся я-б засталася вельмі задаволенай, ад радасьці падпрыгнула-б угору, хоць і старая я.

Таццяна Дзярбінская.

Вёска Кладачкі, Заслаўск. мест. савету.

Наладзіць работу сталоўкі

(*Ліст работніцы*)

У сталоўцы Добрушскай папяровай фабрыкі „Гэрой працы" абеды нясмачныя, бо іх дрэнна падрыхтоўваюць. Штодзенна постны борш, ды і той каштуе 20 кап. Гэта таму, што ў сталоўцы дрэнна арганізаваны самазагатоўкі.

Няма кантролю з боку работніц над сталоўкай. Калі мы аднойчы праверылі якасьць абедаў, дык не знайшлі ніякага ўліку аб выдаткаваньні прадуктаў і тлушчу. Часта бывае недавага хлеба. Зразумела, што такое дрэннае забесьпячэньне б'е па выкананьні прамфінпляну. Гэта адна з галоўных прычын, чаму Добрушская фабрыка з месяца ў месяц ня выконвае прамфінплян.

Ганна Аўраменка.

Дапамажэце наладзіць работу калгасу

(*Ліст дэлегатак*)

У калгасе „Хлебароб Сталіна", Асьвейскага раёну, грашовыя авансы выдаваліся ў нас не па працаднёх, а па душам. Гэтым праявілі кулацкую ўраўнілаўку. Калгасьнікі былі абураны гэтым.



Заг. малочнай фэрмы калгасу „На варце" Крыч. раёну т. Несьцяровіч запісвае апошні удой.

Дзіцячыя ясьлі працавалі слаба. Харчаваньне было дрэннае, ня гледзячы на тое, што было адпушчана 500 руб. Дзесятага верасьня ясьлі зусім закрыліся.

У нас няма дэлегацкага сходу жанчын. Нідзе нашы жанчыны не вучацца. Недахопаў у нас многа, аб іх трэба пісаць.

Возьмем напрыклад кіраўніцтва нашым калгасам. Старшыня тав. Родзін слаба працуе. Калі выдаецца хлеб, то атрымлівае толькі той, які бывае на сходзе, а калі ты ня меў магчымасьці зьявіцца на сход, то хлеба не атрымаеш.

Дрэнна працуе і палявод. Ёсьць безгаспадарчасьць і абязьлічка. Збруя і інвэнтар параскіданы і ляжаць пад адкрытым небам. Ня лепш працуе і рахункавод. Ён выдаваў хлеб не па працаднёх, а як яму спадабалася. Гэты-ж рахункавод зьяўляецца і касірам і загадчыкам малочнай фэрмы і прыёмшчыкам воўны. Якім чынам ён застаўся на працы невядома, бо два разы ён быў падсудным.

Мы зварачаемся ў часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі" з просьбай дапамагчы наладзіць работу калгасу.

Дэлегаткі: Цярэня Матрона, Католік Ганна.

Рэдакцыя чакае ад Асьвейскага Райкалгассаюзу тэрміновага адказу, што зроблена па аздараўленьні кіраўніцтва і працы ў калгасе „Хлебароб Сталіна".

У страве можна знайсьці... салому, сена і іншае

(*Ліст работніцы*)

Сталоўцы пры Шклоўскай папяровай фабрыцы „Спартак" няма чым пахваліцца. Якасьць абедаў дрэнная. Няма паблюднай сыстэмы.

Хаця на кухні падчас ёсьць і два супы і боршч, але атрымаеш ня тое, што папросіш, а тое, што падабаецца повару, альбо афіцыянтцы. Яны ўжо судзяць па знадворнаму выгляду таго, хто просіць альбо па займаемай пасадзе.

Да ўсяго гэтага ў сталоўцы яшчэ брудна. У страве можна знайсьці і сена, салому і нават горш. Па начыньню лазяць каты, а потым у ім падносяць рабочаму есьці.

Ніякага кантролю над сталоўкай няма. Ніхто яе работай ня цікавіцца.

Дырэкцыя, парткалектыў і фабком павінны зьвярнуць увагу на работу сталоўкі.

Работніца.

Рэдакцыя патрабуе ад трыкутніка Шклоўскай ф-кі „Спартак" тэрміновага адказу, што імі зроблена ў справе наладжваньня работы сталоўкі, у справе зьнішчэньня агідных зьявішч, якія там ёсьць.

Трус з трусятн. з-ду „Пол. рэвал." (Менск)

Андрэй Ушакоў

Брыгада Норкінай

(*Нарыс*)

Доўгі корпус швэйна-кецельнага цэху. Пры ўваходзе ў сярэдзіну ён палохае сваёй цішай і яркасьцю афарбоўкі. Непадалёку ад дзьвярэй нібы нерашуча прыпыніліся некалькі варштатаў, быццам баючыся ступіць далей за манумэнтальнасьць калён, што разьмясьціліся па сярэдзіне цэху, трымаючы на сабе цяжар масыўнай столі... Гэта выгляд перад пускам віцебскага панчошна-трыкатажнага камбінату „КІМ“.

Тады пачалі прыходзіць рабочыя, каб у аортах цэхаў забіўся здаровы пульс ударнай працы, каб на поўны голас запелі варштаты песьню індустрыі, каб сотні тон панчох даць працоўнаму спажыўцу Савецкага саюзу. Разам з усімі рабочымі прышлі і яны—6 дзяўчат з розных мясцовасьцяй Віцебшчыны, ня ведаючы адна другую, але скаваныя аднэй ідэяй увайсьці ў гераічныя будні рабочага жыцьця, стаць ля варштатаў моладзьнага вучастку, адным магутным калектывам будаваць сьветлую будучыню сацыялізму. За варштатамі яны ціха з боку прыглядаліся адна да аднэй, у думках меркавалі, як хто працуе. Гутаркі былі афіцыяльныя, абрыўчатыя, пакуль незнаёмыя работніцы перарасталі ў сябровак, якім можна даручыць свае думкі і пачуцьці. Гэтак праца зьбліжала людзей, якія аб'ядналіся ў таварыскія групоўкі. Год таму назад з такой групоўкі і вырасла брыгада Норкінай.

т. Скочылас—ударніца карамельнага цэху ф-кі „Камунарка“, член партыі з 1921 г.

Сначатку кожная работніца працавала асобна на сваім варштаце. У кожнай свой плян, свае клопаты. Пры такой арганізацыі працы ня было тэмпаў калектыўнага задору і энтузіязму.

Норкіна прайшла складаны цяжкі шлях свайго яшчэ нядоўгага жыцьця. Помніць, як у халодную зіму абшарпаная, прытуліўшыся каля вокан сутарэньняўпякарняў, грэлася і тут-жа на марозе пасінелая ад холаду засынала. Востры пах цёплага смачнага хлеба казытаў нос. Пачуцьцё голаду змораю разьлівалася па жылах, кружылася галава. Часамі людзі з літасьці давалі ёй у руку медную дробязь і, занятыя сваімі клопатамі, праходзілі далей, ня бачачы цяжкай пакуты бяспрытульнай дзяўчынкі. Потым выхаваньне ў магілеўскім дзіцячым доме. Тут яна прывыкла да калектывізму. Задорны малады калектыў выхаваў яе жыцьцярадаснай,а праца ў піянэратрадзе, а потым у камсамоле прывучыла да акуратнасьці і стараннасьці. Гэтую стараннасьць і радасьць жыцьця яна прынесла і ў цэх да варштатаў. Тут часамі апавядала сяброўкам пра ранейшае сваё жыцьцё, гутарыла пра будні цэху і ў кожным слове была бязьмежнасьць маладосьці і юнацкі задор. За яе вясёласьць і акуратнасьць у брыгадзе яе любяць. Аднойчы, прышоўшы з камсамольскага сходу ў цэх, Норкіна сказала:

— Давайце арганізуем ударную гаспадарча-разрахунковую брыгаду. Хіба мы горш за ўсіх працуем?—моўчкі чакала адказу. Потым, падумаўшы, дадала:

— Ну, дык як, дзяўчаткі?..—І яе твар з крышку ўзьнятым носам, які даваў ледзь прыкметную заўсёдную ўсьмешку, агні вачэй, вёрткасьць і размашыстасьць фігуры нарадзілі шчырую задорнасьць і ўпэўненасьць у словах. Некаторыя хацелі спаслацца на няведаньне гэтай справы, прапанавалі пачакаць, „як усе, так і мы“, але палкія агні вачэй, давер'е да яе і падрабязныя апавяданьні пра выгоднасьць гаспадарчага разрахунку для дзяржавы і для работніц упэўнілі сябровак. Тады яны аднагалосна сказалі.

т. Мальчук—інструктар фабзавучу ф-кі „Камунарка“.

— Толькі ты будзь у нас брыгадзірам. Кіруй справай. Будзем працаваць.

І гэта былі першыя крокі, каб потым перайсьці ў шпаркую хаду, у бальшавіцкія тэмпы.

* * *

Раніцой, перад пачаткам працы, з плянавага аддзелу паведамляюць дзеннае заданьне выпрацоўкі брыгады. У бляшаны квадратовы шчыт, што прымацаваны на дрэўку да кожнага варштату, устанаўляецца лічба „30“.

Трыццаць дзесяткаў панчох трэба выпрацаваць кожнай работніцы, а ўсёй брыгадзе—180. Сабраўшыся ў гурт, дзяўчаты абмяркоўваюць, колькі кожная дае сёньня сустрэчны. Кожная выбірае сама, колькі зможа выпрацаваць за 7 гадзін... Сёньня ўсе прыйшлі з выходнага, адпачыўшы, бадзёрыя, вёрткія.

Старшыня дэпутацкай групы заводу „Камунар“ т. Акуценка.

Таму на дошцы брыгады ў графе „сустрэчны“, абмеркаваўшы, брыгадзір крэйдаю піша „34“.

Гэта самая большая лічба з усёй выпрацоўкі папярэдніх дзён. Над кожным варштатам чырвоны бляшаны сьцяжок „Ударнік“—гонар перад іншымі варштатамі, якія ня выконваюць пляну, гэта гонар за тэмпы, за якасьць, за высокую выпрацоўку і гэта заваяванае права брыгада Норкінай не здае.

З вязальнага цэху ў швэйна-кецельны панчохі прыходзяць яшчэ недароблены, у іх трэба зашыць насок і абрубіць. Павольна пад часты рытмічны гоман жалеза паварачваецца дыск невялічкага кецельнага варштату. Работніцы на-хаду насаджваюць на дробныя зуб'і дыску панчохі, каб кожны зуб трапіў якраз у вочкі. Іначай будзе брак. Такая праца ў работніцы вымагае напружанасьці зроку і шпаркасьці рухаў. Перад пачаткам зьмены кожная кятлёўшчыца дбайна аглядае свой варштат. На дрэннай і бруднай машыне не дасі высокаякаснай прадукцыі. Ад гэтага шмат у чым залежыць добрае выкананьне пляну. Не дагледзіш у час, затупяцца іголкі і будуць рваць панчохі. Іголка крыва насаджана, таксама будзе брак. За год сваёй працы яны прызвычаіліся да сваіх варштатаў, ведаюць іх да самай маленькай шрубкі. Адразу відаць прычына, чаму варштат працуе дрэнна, і работніцы аб усіх непаладках зараз-жа паведамляюць мэханіка. Сумесная праца зьяднала брыгаду ў адно цэлае. За год ня было цякучасьці, усе прызвычаіліся адна да аднэй. Бывае, захварэе хто з брыгады, адразу адчуваецца сяброўскі сум і гэтае парожняе месца на крэсьле супроць варштатаў трывожыць і непакоіць думы.

Затрыманьне ў аднэй работніцы ў працы—другая дапамагае насаджваць панчохі на зуб'і дыску, каб нажы не працавалі ўпустую.

За напружанай працай шпарка прабягае дзень. Зусім няпрыкметна сьветлую афарбоўку раніцы зьмяняе шэры колер раньняга адвячорку. Няпрыкметны дзень таму, што яны ўсімі думкамі і парыванынямі ўваходзяць у працу. Трэба ўшчыльняць кожную сэкунду. Іначай нельга. Няпрыемна з першага месца папасьці на апошняе, бо брыгада выклікала на сацспаборніцтва суседнія варштаты, і цяпер у кожнай работніцы ў думках паўстае адно „не падпацца“. Кожны член брыгады таксама спаборнічае паміж сабой. Пункты іх здаюцца да чаго простымі: давесьці цыраваньне панчох па сваёй віне да нуля, па віне машын—да 3 процантаў, ломку іголак—да аднаго процанту. Але выкананьне гэтых пунктаў патрабуе шмат увагі і энэргіі. І брыгада не здае заваяваных пазыцый у сацспаборніцтве. Месячная выпрацоўка яе 107—112 і 117 проц. у той час, як цэхавае выкананьне пляну толькі 86 проц. Тэхніка навейшага абсталяваньня перарасла брыгаду. Работніцы не аўладалі ёю. Брыгада-ж Норкінай стала на вышыні тэхнікі сваіх варштатаў. Усе члены брыгады наведваюць вытворчыя нарады, вывучаюць тэхніку. Фабрыка прэміявала брыгаду Норкінай, як лепшую, домам адпачынку.

Да канца работы ля кожнага крэсла вырастае куча гатовых панчох. Прыходзіць зьмена, кожная работніца здае свой варштат, чысьціць яго. Такой-жа чыстаты і акуратнасьці брыгада патрабуе ад сваёй зьмены. Брыгадзір пералічвае панчохі, запісвае ў кніжку ўліку. Потым брыгада дапамагае занесьці ў плянавы аддзел сваю дзенную выпрацоўку. Яны выканалі свой сустрэчны. Замест 80-ці кожная дае 35. Брыгадзір Норкіна выпрацоўвае 38. Абвяшчаюцца вынікі. Лішняя выпрацоўка кожнай пары панчох нараджае ў сябровак творчую здаровую зайздрасьць і ведае брыгадзір, заўтра яны будуць напружваць усе сілы, каб даць выпрацоўку, роўную з Норкінай, каб не адстаць у сацспаборніцтве, а потым будуць напружана чакаць, калі бракер будзе правяраць якасьць выпрацоўкі. Кожная забракаваная панчоха іх хвалюе, робіцца соромна за сапсаваны матар'ял, соромна перад сваімі сяброўкамі і суседняй брыгадай, з якой яны спаборнічаюць. Перад адыходам са зьмены крэйдаю побач з другімі дошкамі ўліку Норкіна ставіць тлустай рыскай лічбу выкананьня 214. Гэта гордасьць брыгады перад суседнімі брыгадамі, у якіх з дошкі сарамліва паглядаюць неразборлівыя—150—170, яна сьмяецца сваім сваяасаблівым шыпучым сьмехам, у якім гучыць прагнасьць жыць, радасны творчы энтузіязм.

г. Віцебск,
Кастрычнік 1932 г.

т. Цішкова—ударніца заводу „Бальшавік“. У дні Кастрычніка ўступіла ў партыю.

Пытаньні вылучэньня і пераквалiфікацыі работніц на належную вышыню

Ужо ня раз даваліся партыяй і ўрадам дырэктывы аб вылучэньні работніц, кваліфікацыі іх, перасоўваньні на вышэйшыя разрады.

Як-жа выконваюцца гэтыя дырэктывы?

Перад намі матар'ял брыгады ЦСПСБ, якая абсьледавала два прадпрыемствы Гомелю—абутковую „Праца" і швэйную фабрыку „Камінтэрн". Паглядзім, аб чым кажа гэты матар'ял.

На абутковай фабрыцы „Праца" ёсьць вялікія дасягненьні па ўцягненьні жаночай працы ў вытворчасьць. У 1929 г. на фабрыцы было 15 работніц, на першае кастрычніка 1932 году—345. Гэта—41,9 проц. да агульнага ліку рабочых.

За апошні час вылучана 12 работніц. Калі раней жанчыны выконвалі выключна дапаможную работу, то зараз значная колькасьць працуе на вядучых прафэсіях. Парткалектывам і фабкомам многа зроблена па павышэньні кваліфікацыі работніц. Пры падрыхтоўцы кадраў заўсёды была зьвернута ўвага на пераквалiфікацыю жанчын і прасоўваньне іх на вышэйшыя працэсы вытворчасьці. Зараз работніцы працуюць на ўсіх работах: па другім разрадзе—173 работніцы, трэцім—111, па чацьвёртым—31, па пятым—17, па шостым—3, па сёмым—1 і восьмым—1.

На фабрыцы ёсьць поўная магчымасьць замяніць значную частку апэрацый, на якіх працуюць мужчыны, жаночай працай. Зараз праводзіцца работа па прасоўваньні работніц на вышэйшую кваліфікацыю.

На фабрыцы існавалі гурткі па вывучэньні тэхнікі вытворчасьці. У гурткох прымалі ўдзел каля 80 жанчын. Вялікая частка работніц накіравана на пераквалiфікацыю. 29 работніц вылучаны на вядучыя працэсы вытворчасьці.

У гаспадарча-разрахунковых брыгадах—28 работніц. Ударніц, якія маюць карткі ўдарніка—103. Дакладнага ўліку прагулаў сярод работніц няма, але ўсё-ж процант прагулаў з боку работніц значна ніжэйшы, чым рабочых. У асноўным прычыны прагулаў тлумачацца сямейнымі абставінамі. Праўда, ёсьць пры фабрыцы дзіцячая пляцоўка, але яна ня можа поўнасьцю задаволіць работніц.

Віцебская швэйная фабрыка „Сьцяг індустрыялізацыі".

***

На фабрыцы „Камінтэрн" трыкутнік не займаецца пытаньнем вылучэньня работніц і пераводам іх на вышэйшую кваліфікацыю. Бюро цэхячэек і парткалектывы ні разу не заслухоўвалі дакладаў вылучэнак аб іх рабоце. Таму ня дзіва, што часта бываюць недарэчнасьці.

Загадчык бюро рабочага вынаходзтва швэйнай фабрыкі „Кастрычнік" т. Грэк.

Работніца т. Ліфшыц скончыла курсы чырвоных дырэктароў, а потым працавала ў бюро рабочага вынаходзтва. Але замест дапамогі, загадчык тав. Сорын ігнараваў тав. Ліфшыц. На гэта парткалектыў не рэагаваў. Ня лепш было і з работніцай тав. Бэргер—дырэктарам па працы. За год работы ёй не аказалі ніякай дапамогі. І раптам, у адзін прыгожы дзень дырэктар загадаў ёй здаць справы другому работніку.

Няма ніякага ўліку і сувязі з вылучэнкамі па-за прадпрыемствам. Фабрычныя арганізацыі нават ня ведаюць, дзе яны працуюць. Работніца Собінава вылучана нам. загадчыка магазыну ЗВК. Першы час ёй прыходзілася працаваць у цяжкіх умовах. Загадчык магазыну (беспартыйны) ігнараваў яе і не даваў магчымасьці азнаёміцца з тэхнічнай пастаноўкай работы па магазыну. Фабрычныя арганізацыі ведалі, у якіх умовах працуе тав. Собінава, і ўсё-ж ні разу не заслухалі яе дакладу, каб дапамагчы.

З пераводам жанчын на вышэйшую кваліфікацыю справа стаіць ня зусім добра. Па бручна-суконнаму цэху, дзе працуе 24 работніцы, на 5—6 разрадзе няма ні адной. Па піджачна-суконнаму цэху—13 жанчын на 5—6 разрадзе з 127 работніц, якія там працуюць. Па шапачнаму цэху працуе 32 работніцы і толькі адна на вышэйшым разрадзе. Па закройнаму цэху з 16 работніц, па 5—6 разраду—3, па заказному з 54 работніц—14. Гэта паказвае, што нават там, дзе на прадпрыемстве работніц больш паловы ўсіх рабочых, толькі нязначная частка знаходзіцца на кваліфікаванай рабоце. З боку партыйнай і прафсаюзнай арганізаныі ня зроблена пералому ў гэтай справе, таму амаль усе жанчыны працуюць на нізкіх кваліфікацыях.

Работніцы мала ўцягнуты ў рацыяналізатарскую работу, у работу вытворчых нарад. З 148 прапаноў работніцамі ўнесены толькі 14. Гэты факт лішні раз падкрэсьлівае слабую работу сярод

жанчын па разьвіцьці рацыяналізатарскай думкі. Работніц-вынаходцаў на прадпрыемстве зусім няма.

Актыўны ўдзел работніцы прымаюць у сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве. У гаспадарча-разрахунковых брыгадах 732 чалавекі, з іх 436 работніц. Старшых брыгадзіраў з 46 дваццаць сем работніц. Ударныя карткі маюць 481 чалавек, з іх палова работніц. Прафсаюзным членствам ахоплены ўсе работніцы.

У тэхнічную вучобу мала ўцягнута жанчын. У вытворча-тэхнічнай школе займаецца 600 чалавек, а работніц усяго 200.

Многа зроблена па падрыхтоўцы кадраў. За 1931-32 год перакваліфікавана 225 работніц.

Ёсьць вялікія дасягненьні па паляпшэньні культурна-бытавых умоў работніц фабрыкі. Пабудаваны ясьлі на 120 дзяцей і пляцоўка на 50. Адно з галоўных дасягненьняў—гэта ліквідацыя ўсімі работніцамі сваёй непісьменнасьці ў 1931 годзе. Зараз на фабрыцы зусім няма непісьменных жанчын.

Буйным недахопам зьяўляецца і тое, што на фабрыцы зусім няма дэлегацкага сходу.

* * *

Ня гледзячы на тое, што на швэйнай і абутковай фабрыках працуе значная колькасьць жанчын, ЗРК гэтых прадпрыемстваў не забясьпечвае работніц адпаведным асартымэнтам тавараў.

Прыведзеныя факты абсьледваньня двух Гомельскіх прадпрыемстваў паказваюць нашы посьпехі ў галіне ўкараненьня жаночай працы ў абутковую прамысловасьць і прасоўваньня работніц на вышэйшую кваліфікацыю. Таксама мы маем вялікія посьпехі па ліквідацыі непісьменнасьці жанчын на фабрыцы „Камінтэрн" і паляпшэньні быту. Але няма яшчэ належнай увагі рабоце вылучэнак на фабрыцы „Камінтэрн". Яшчэ мала зроблена па павышэньні іх кваліфікацыі і прасоўваньні на вядучыя працэсы вытворчасьці.

Вялікім недахопам зьяўляецца тое, што дэлегацкія сходы не працуюць. Парткалектыў фабрыкі „Камінтэрн" павінен зараз-жа выправіць гэту памылку. Недаацэнка пытаньня вылучэньня і перакваліфікацыі работніц павінна атрымаць рашучы адпор. Дырэктывы партыі і ўраду павінны быць выкананы.

Работу ясьляй паставіць узорна

Ясьлі пры Віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыцы „КІМ" знаходзяцца ў новых, сьветлых пакоях. Абсталяваньне ня дрэннае. Але, калі мы прыгледзімся глыбей, то знойдзем многа недахопаў.

Цеснавата. Пакой для гульняў старшай групы сумяшчаецца з спальняй. Падлога кепска афарбавана, таму бруд не заўважаецца на першы погляд.

ЗРК слаба забясьпечвае ясьлі прадуктамі, асабліва белым хлебам. Адпушчаныя прадукты дрэннай якасьці—малако заўсёды пераісшае.

Няма пральні і бялізна мыецца ў прыбіральні, у якой заўсёды брудна. Бялізна гатуецца на кухоннай пліце разам з ядой.

Няма пляцоўкі для гульняў на сьвежым паветры. Дзеці бегаюць на тэрыторыі фабрыкі, там-жа дзе і жывёла. Усе гэтыя недахопы зьяўляюцца вынікам незацікаўленасьці фабрычных арганізацый работай ясьляй.

Трэба, каб дырэкцыя, парткалектыў і фабком у хутчэйшым часе заняліся пытаньнем лепшага забесьпячэньня ясьляй харчамі. Трэба адвесьці памяшканьне для пральні.

Ясьлі маюць усе магчымасьці паставіць работу ўзорна. Трэба больш арганізаваць бацькоў вакол гэтай работы.

Брыгада: Юзафатава, Журавінкіна.

Узмацніць працу з жанчынамі

Па Узнацкім сельсавеце (Крупскі раён) працы з жанчынамі партыйная ячэйка не вядзе. Сходы дэлегатак не праводзяцца, культмасавая праца таксама адсутнічае. Часопісі і газэты жанчыны ня выпісваюць і ня чытаюць. Праца ліквунактаў у калгасах распачата, але шмат дзе жанчыны ліквунтаў не наведваюць і да гэтага ніхто ніякіх захадаў ня прымае. Працы з вылучэнкамі няма.

Партыйная ячэйка недаацэньвае гэтай важнай працы і ня кіруе ёю. Райком партыі павінен прыняць рашучыя меры да Узнацкай партячэйкі, якая ня выконвае дырэктыў партыі аб працы сярод жанчын.

Ян Алексяёнак.



У дзіцячым садзе. Паліваюць кветкі.

Больш чуласьці і ўвагі да работніц

Рытмічны гук малаткоў зьліваецца з грукатам варштатаў. Па ўсім сьлясарна-зборачнам цэху чуцён адзіны шум, які дзесьці далёка зьнікае. Пад'ёмны крант рухаецца ўзад і ўперад. То ён падымае, то апускае брускі мэталю, гатовыя варштаты.

За тры гады непамерна вырас машына-будаўнічы завод імя Варашылава. Дабавіўся новы кацельны цэх. Не пазнаць і сьлясарна-зборачнага. Ён значна пашырыўся. Многа прастору і сьвятла.

Ня рэдка ля такарнага і сьлясарнага варштату ўбачыш дзяўчыну. У якіх умовах тут працуюць жанчыны, як яны пасьпяваюць, якія адносіны да павышэньня іх кваліфікацыі? Гэтыя пытаньні моцна зацікавілі мяне.

І калі сьціхае шум і грукат варштатаў у часе абедзенага перапынку, чую гутарку работніц паміж сабой.

— У нас многа дзяўчат кінула завод за гэты год,—кажа чарнавокая дзяўчына ў чырвонай хустачцы. Цікава, што за апошнія два месяцы прынята 15 чалавек, а кінула 13. Чаму гэта так, і сама не разумею.

— Гэта вельмі проста—адказвае другая работніца.—У нас няма зацікаўленасьці жанчын у рабоце, бо яны ня бачаць пэрспэктыў росту, пэрспэктыў павышэньня кваліфікацыі. Большасьць дзяўчат працуе на другім, радзей на трэцім разрадзе. А калі адзінкі дайшлі да 4-га разраду, яны далей ня рухаліся. Здольныя дзяўчаты, скончыўшыя фабзавуч, працавалі некалькі год на другім разрадзе. Некалькі раз яны падавалі заявы пакуль іх перавялі на 3-ці.

І сапраўды, ня цяжка пераканацца ў тым, што на заводзе і да гэтага часу ёсьць яшчэ коснасьць да ўкараненьня жаночай працы ў вытворчасьць. Работніца Голуб працуе ўжо 4 гады сьлесарам. Яна член бюро партколектыву, добрая ўдарніца, мае ўсе даныя падымацца вышэй па кваліфікацыі. А ўсё-ж такі т. Гобуб далей чацьвертага разраду не пайшла. Тав. Райцэс працуе два гады. Здольны сьлесар, але чамусьці на вышэйшую кваліфікацыю яе не пераводзяць.

У некаторых майстроў і да гэтага часу адсталыя погляды на работніцу. Яны ня здольны разумець, што работніца можа стаяць на адным узроўні па кваліфікацыі з рабочым. Нядаўна быў выпадак, калі адзін з брыгадзіраў адмовіўся прыняць у брыгаду па зборцы сьвідравальных варштатаў жанчыну.

Тав. Бэнэнсон.

— Убярэце ад мяне ўсіх баб, дык справа пойдзе лепш—кажа ён.—На ўсялякі выпадак можна пакінуць адну для паказу.

Калі мы пыталіся ў майстра такарнага цэху т. Міньковіча, хто лепшыя ўдарніцы, ён казаў, што ў яго амаль няма добрых работніц, што ўсе не працуюць па-ўдарнаму.

Але выявілася, што ў цэху ёсьць добрыя ўдарніцы, якія прэміяваны. Тав. **Бэнэнсон** — токар па мэталі, добрая ўдарніца, прэміявана ў міжнародны юнацкі дзень, таксама тав. Фішэльман. Ёсьць і іншыя добрыя ўдарніцы.

— Часта, калі вылучаюць жанчыну да варштату, сустракаешся з цяжкасьцямі, з адсталымі поглядамі—кажа тав. Ш.—Калі паравялі прыбіральшчыцу кацельнага цэху тав. Бабіцкую на працу да сьвідравальнага варштату, былі вялікія спрэчкі з адміністрацыяй цэху. Майстар т. Мірскі ўпорліва настойваў, што тав. Бабіцкая ня справіцца з работай. Яго думку падтрымаў і брыгадзір Мішчанка. Прышлося цэхкамітэту шмат патраціць сілы, каб т. Бабіцкая засталася працаваць на варштаце. Тав. Бабіцкая спачатку ня мела ніякага кіраўніцтва з боку майстра. І старым работніцам прышлося адрывацца ад варштату і паказваць ёй, як працаваць.

Гэты факт выразна гаворыць аб бяздушнай закараняласьці, аб старых поглядах. іх трэба ў корані зьнішчаць, вытруціць з пралетарскага асяродзішча.

— Партыйная арганізацыя заводу не зрабіла ўсяго для замацаваньня жаночай працы ў вытворчасьці, для павышэньня кваліфікацыі работніц—кажа адна з прысутных. Ня створана грамадзкая думка вакол гэтага пытаньня.

Часта сустракаешся з няправільнымі ўзаемаадносінамі паміж рабочымі і работніцамі. Чым іншым, як не зьнявагай да работніц можна тлумачыць такі факт, што калі работніца робіць малейшую памылку, дык шмат хто на яе накідаецца з рознай лаянкай, зьневажае яе, разводзіць розныя плёткі па яе адрасе.

Нядаўна быў абураючы факт. У такарным цэху выдумалі на работніцу жудасныя паклёпы толькі таму, што яна адважылася напісаць заметку ў насьценгазэту на сакратара камсамольскай ячэйкі, які спаў на рабоце. Гэту работніцу на кожным кроку цкавалі. Праўда, гэта пытаньне разьбіралася на сходзе цэхавай парт'ячэйкі. Далі рашучы адпор такім ганебным зьявішчам. Вінаватыя ў заціску самакрытыкі атрымалі партспагнаньне.

— А як-жа з вылучэньнем? — пытаюся я.

— Аб гэтым мы ўжо даўно забылі — адказалі амаль усе разам. У кіруючых органах заводу няма ні аднэй вылучэнкі. А ці-ж няма з нас здольных працаваць у заўкоме, бюро парткалектыву, дырэкцыі?

— А справа ў тым, — кажа С.,—што ніякай выхаваўчай работы не праводзіцца на заводзе. Дэлегацкі сход не працуе. Зразумела, што гэта ўплывае на работніц. Дзе-ж вучыцца кіраваць, калі не на дэлегацкіх сходах?— Гэта-ж школа практычнай работы.

Канец гл. на 3 стар. вокл.

ПАРАДЫ ДОКТАРА

ЗУСІМ ЛІКВІДУЕМ ВОСПУ

На падставе агульных дасягненьняў на гаспадарчым і культурным фронце ў Савецкім саюзе мы маем вялікія посьпехі ў галіне сацыялістычнай аховы здароўя—значнае зьніжэньне захворваньня і сьмяротнасьці як агульнай, так і ў асаблівасьці дзіцячай.

Пры сацыялістычнай сыстэме аховы здароўя мы маем усе падставы на бліжэйшыя гады ставіць пытаньне аб ліквідацыі цэлага раду эпідэмічных захворваньняў.

Адным з такіх захворваньняў, ліквідаваць якое мы маем усе даныя, зьяўляецца воспа.

Хвароба пачынаецца раптам. Павышаецца тэмпэратура. Зьяўляецца ламата цела, ванітаваньне. Праз 3—4 дні становішча паляпшаецца, а зьяўляецца высыпка часьцей за ўсё на галаве і твары.

Праходзяць 2—3 дні пасьля зьяўленьня сыпі. І тут ужо пачынаецца самы цяжкі, страшны пэрыяд хваробы.

Апрача вялікай жары хворы траціць прытомнасьць, пухне твар, ацякаюць вочы. Сэрца перастае добра працаваць.

Ёсьць асабліва цяжкая форма воспы, так званая крывяністая, ці, як яе завуць, „чорная воспа". „Чорная воспа" амаль заўсёды канчаецца сьмерцю.

Адзіным верным спосабам папярэджаньня воспы зьяўляецца супроцьвосьпеная прышчэпка.

Кожны, каму яшчэ ня прышчэплена воспа або прышчэплена ды не прынялася, ці прышчэплена даўно—4—5 год назад, павінен зрабіць прышчэпку. Прычэпкі трэба рабіць і маленькім дзецям, пачынаючы ад двух месяцаў.

Прышчэпкі робяцца так званай восьпенай вакцынай—г. зн. аслабленай восьпенай атрутай, якая разьмешана ў такой ступені, што захварэць ад яе ні ў якім разе нельга.

Восьпеная вакцына рыхтуецца такім чынам: восьпеная атрута прышчапляецца ў скуры маладых цялят. На скуры цялят утвараюцца пухіркі, якія напоўнены вадкасьцю. Гэта вадкасьць з пухіркоў выпускаецца чыстым спосабам. Яна і зьяўляецца тэй, вакцынай, якую прышчапляюць людзям.

Дзякуючы гэтай, уведзенай у арганізм чалавека, зусім маленькай колькасьці вакцыны ў крыві чалавека выпрацоўваецца супроцьяд, які трымаецца ў арганізьме 4—5 год і, дзякуючы яму, чалавек не захворвае.

Прышчэпкі не выклікаюць болю. Прышчэпленая воспа працякае вельмі лёгка. На месцы прышчэпкі зьяўляецца на другі—трэці дзень чырвань і потым маленькі пухірок, а калі загоіцца, застаецца толькі маленькі рубчык.

Такім чынам прышчэпкі зусім бясшкодны, а карысьць вельмі вялікая таму, што мы пазбаўляемся ад такога страшнага захворваньня.

Даведацца аб тым ці прышчапілася воспа можна пасьля зьяўленьня чырвані вакол драпінкі і пасьля ўтварэньня пухірка. Калі чырвань не зьявілася, значыцца, воспа не прышчапілася і яе трэба паўтарыць у тым-жа годзе.

Прышчэпку воспы робяць усе амбуляторыі, сельскія мэдыцынскія вучасткі, кансультацыі дзяцей і матак. Таксама арганізуюцца масавыя прышчэпкі ў інтэрнатах калгасаў, саўгасаў, куды зьяўляюцца мэдпрацаўнікі.

Кожная работніца, калгасьніца павінны рабіць сабе і сваім дзецям прышчэпкі і растлумачыць другім карысьць прышчэпак — быць ініцыятарамі на фабрыцы, заводзе, калгасе, саўгасе і г. д. па арганізацыі масавых прышчэпак.

Работніцы і калгасьніцы, забесьпячэньне сябе і вашых дзяцей ад страшнай хваробы воспы—у вашых руках.

Памятайце, што здароўе працоўных ёсьць справа іх самі х.

Пагалоўныя прышчэпкі зусім пазбавяць вас ад воспы.

Д-р Дземянкоў.

Палітэхнізацыя школы.

Больш чуласьці і ўвагі да работніц *(канец)*

Зразумела, што калі-б на заводзе была добра пастаўлена жанработа, работніца-б лепш разьвівалася, павышала-б свой культурны ўзровень. Гэта-б стварыла ў яе ўпэўненасьць у свае сілы. Яна-б лепш павышала сваю кваліфікацыю, яна-б магла далей расьці. Тады-б лягчэй было зламаць коснасьць сярод паасобных рабочых да ўкараненьня жаночай працы ў вытворчасьць.

Нетаварыскія адносіны да работніц — гэта старыя погляды, спадчына капіталізму. У пралетарскім асяродзішчы, ім няма месца.

Прашло ўжо XV год ад Кастрычніцкай рэвалюцыі, якая дала ўсе палітычныя правы працоўнай жанчыне. Падобныя факты, якія наглядаюцца на заводзе імя Варашылава, не павінны пляміць нашу сучаснасьць.

Толькі разгорнутай масавай работай сярод рабочых і работніц можна палажыць канец старым антыпралетарскім поглядам на работніцу.

Парткалектыў павінен разгарнуць гэту работу. **Алена.**

Цана асобнага нумару 10 кап.

ЯШЧЭ АДНА ПЕРАМОГА
на фронце бытавога абслугоўваньня работніц

1772

Вагоны для маці і дзіцяці

Менскі вагона-рамонтны завод „Полымя рэвалюцыі“ перабудаваў вагоны для маці і дзіцяці.

Задача вагону — даць культурныя ўмовы маці і дзіцяці ў часе пераезду.

У вагоне абсталёўваюцца дзіцячы душ з падводам цёплай вады, дзіцячая ігралка-салён, плітка для падагравaньня стравы і дзіцячая прыбіральня.

Вагон круглыя суткі будзе забясьпечан гатаванай вадой.

Да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, паштова-пасажырскі цягнік Менск—Масква накіроўваецца з вагонам маці і дзіцяці.

К.

Што зроблена па допісах рабселькорак

Герасімовіч зьнят з працы

Допіс селькоркі „П'яніца“ аб тым, што загадчык складу калгасу імя Дзяржынскага (Менскі прыгарадны сельсавет) сыстэматычна п'янстваваў за калгасныя грошы—пацьвердзіўся.

Менскі райкалгассаюз паведаміў, што Герасімовіч зьнят з працы.

* * *

Допіс „Зрыўшчыкаў да адказнасьці“ аб тым, што з-за адсутнасьці ясьляй у калгасе „1-е мая“ (Слуцкі раён) з 60 чалавек на працу выходзіць толькі 20—30 проц.—правільны.

Слуцкі райкалгассаюз паведамляе, што праўленьне дагаварылася з гарадзкімі ясьлямі, калгасьніцы носяць туды сваіх дзяцей і акуратна выходзяць на працу.

Клясавыя ворагі прыцягнуты да адказнасьці

Допіс „Выкрыем клясавых ворагаў“ аб тым, што клясава варожыя элемэнты калгасу „Чырвоны пуцілавец“ (Тураўскі раён) Кулевіч Кацярына і Блоцкая Ганна кралі жыта, пшаніцу з поля калгасу,—падцьвердзіўся. Кіраўніцтва міліцыі Тураўскага раёну паведамляе, што вінаватыя прыцягваюцца да судовай адказнасьці.

* * *

Факты ў допісу „Умацаваць арганізацыйна-гаспадарчае становішча калгасу „Чырвоны клеваў“ аб тым, што ў калгасе мелася безгападарчасьць—пацьвердзіліся.

Слуцкае бюро скаргаў РКК паведамляе, што з калгасу вычышчана пяць заможнікаў, якія падрывалі працу калгасу. Зьменена кіраўніцтва калгасу

ЗДАВАЙЦЕ
ПАДПІСКУ
НА ЧАСОПІСЬ
РАБОТНІЦА і КАЛГАСЬНІЦА
БЕЛАРУСІ
ЛІСТАНОСЦАМ
АБО
НА ПОШТУ
ЧАСОПІСЬ
ВЫХОДЗІЦЬ
3 РАЗЫ
Ў МЕСЯЦ
КАШТУЕ 20 КАП.
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
МЕНСК, САВЕЦКАЯ 63,
3-І ПАВЕРХ, ПАКОЙ № 11.

Выданьне ЦК КП(б)Б.

Адк. рэдактар Э. ШАПІРА

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 2687 У ліку 8.400 экз. Уп. Галоўлітбелу № а—4